АДДЗЕЛ АДУКАЦЫІ, СПОРТУ І ТУРЫЗМУ БЕРАСТАВІЦКАГА РАЙВЫКАНКАМА
ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ “АЛЕКШЫЦКАЯ СЯРЭДНЯЯ ШКОЛА”

Рэспубліканскі конкурс

# “Ніколі не забудзем: унукі аб вайне”

Аўтар:
Альшэўская Вікторыя, 10 гадоў
Гродзенская вобласць
Бераставіцкі раён
аг.Алекшыцы
вул. 60 гадоў Перамогі, 4

Прайшло семдзесят гадоў, як Беларусь вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Семдзесят гадоў над намі блакітнае, мірнае неба. І гэта не падарунак лёсу. Нашы бацькі, дзяды і прадзеды змагаліся за тое, каб мы былі шчаслівыя. Няшмат засталося тых, хто, не шкадуючы сябе, крок за крокам праз усе страты, боль, смутак набліжаў Перамогу. Яна прыйшла да нас з яркай непаўторнай вясной. Гэта свята са слязьмі на вачах. Кожная сям'я захоўвае памяць пра сваіх блізкіх, пра сваіх герояў.

Праз пекла вайны прайшла і мая прабабуля Лазаровіч Ганна Львоўна, удзельніца бітвы пад Сталінградам. Дзвесце дзён і начэй працягвалася Сталінградская бітва. Яна стала рашаючай бітвай Другой сусветнай вайны і пераламала яе ход. Я не перастаю здзіўляцца стойкасці і мужнасці абаронцаў Сталінграда. І хоць у маёй прабабулі даволі сталы ўзрост, 90 гадоў, тыя ваенныя падзеі сямідзесяцігадовай даўніны да гэтага часу ў яе памяці. На фронт бабуля пайшла па закліку камсамола. Спачатку салдатамі сталі яе старэйшыя браты, а потым і яна, зусім маладая дзяўчына. Час для нашай Радзімы тады, у пачатку тысяча дзевяцьсот сорак другога, быў вельмі цяжкі. Вораг імкнуўся да Волгі, хацеў адрэзаць ад Масквы эканамічна важны рэгіён краіны.

…Іх было дзвесце маладых дзяўчат - будучых разведчыц-назіральніц. Перад адпраўкай на фронт яны тэрмінова праходзілі навучанне. Вывучалі розныя віды нямецкіх самалётаў, вучыліся распазнаваць іх па гуле матораў у небе, а таксама набывалі ўменні і навыкі работы з радыёстанцыяй. Перад дзяўчатамі ставілася канкрэтная і вельмі адказная задача: своечасова папярэджваць пра паветраныя налёты ворага, даваць артылерыстам-зенітчыкам як мага больш дакладныя каардынаты нямецкіх самалётаў. Вучоба была непрацяглай, і хутка дзяўчат накіравалі на фронт. Іх назіральныя пункты знаходзіліся на пярэднім краі, і баявая работа праводзілася пад агнём праціўніка. Прабабуля ўспамінае:

- Мы вельмі стараліся, вывяралі каардынаты, каб як мага дакладней перадаць нашым зенітчыкам курс фашысцкіх бамбардзіроўшчыкаў. І як жа мы радаваліся, калі варожыя самалёты ўзрываліся ад свайго ж смяротнага грузу! Вораг бязлітасна бамбіў Сталінград. Уздымаліся ў паветра, гарэлі дамы, заводы, фабрыкі. Здавалася, што гарэла зямля і само неба. Наш дзясяты асобны батальён знаходзіўся ў самым цэнтры гэтага пекла. І як мы былі ўдзячны камандзіру батальёна А.П. Тураўскаму, які, як родны бацька, клапаціўся пра нас, васямнаццацігадовых дзяўчат, асцерагаў ад немінучай смерці.

Назіральныя пасты дзясятага асобнага батальёна некаторы час знаходзіліся і на Мамаевым кургане. На гэтым узвышшы, на правым беразе Волгі, у Цэнтральнам раёне Сталінграда, ішлі баі дзвесце дзён і начэй. Курган абазначаўся на ваенна-тапаграфічных картах як Вышыня 102,0. Ён з'яўляўся цэнтральным ланцужком у агульнай сістэме абароны Сталінграда. Менавіта тут, у раёне Мамаева кургана, 2 сакавіка 1943 года закончылася Сталінградская бітва. Над курганам бесперапынна кружылі фашысцкія самалёты, скідалі

бомбы, міны, снарады, вакол бушавала мора агню і дыму. На гэтай выпаленай агнём тэрыторыі дзяўчаты праяўлялі і ваеннае майстэрства, і мужнасць.

- Тут мы не толькі вызначалі курсы варожых самалётаў, але і напрамкі руху танкаў, размяшчэнне агнявых кропак, кулямётных гнёздаў, — успамінае прабабуля. — Фашысты атакавалі Мамаеў курган, і нам разам з салдатамі не раз даводзілася адбіваць іх атакі. Вораг упарта імкнуўся да Волгі, хацеў акружыць Сталінград, а яго абаронцы праяўлялі мужнасць, сілу. Зенітчыкі, якім мы перадавалі каардынаты, вялі агонь нават з плывучых баржаў , стралялі па ворагах з усіх відаў узбраення…

А потым была пераправа праз раку Волгу.

- Ніколі не забуду, як дабіраліся з Мамаева кургана да перапрвы, — гаворыць мая прабабуля. — Спускацца было цяжка і вельмі страшна. Вакол свісталі кулі, з неба сыпаліся бомбы, але не гэта нас палохала. Палохала нас тое, што зямля была пакрыта забітымі і параненымі. На пераправе нас чакалі баржы. І ступіць на іх, а потым плысці пад прыцэламі самалётаў таксама было вельмі страшна. Многія з тых, хто пераправўляўся, так і не даплылі да супрацьлеглага берага. Перад тымі, хто даплыў, была пастаўлена задача: у самы кароткі тэрмін вырыць катлаван для падземнага завода па выпуску артылерыйскіх снарадаў. І байцы батальёна рабілі гэта пад агнём праціўніка. Мы валіліся з ног ад стомы, рукі распухлі ад мазалёў. Але задача была выканана ў тэрмін: устанавілі і наладзілі абсталяванне. І завод стаў выпускаць снарады. Нашы дзяўчаты выконвалі па некалькі нормаў, а франтавікі прасілі: ”Мілыя, зрабіце больш. Ад вас залежыць абарона Сталінграда”. І мы рабілі немагчымае, здзіўляліся, адкуль у нас толькі бяруцца сілы…

- А потым наш батальён прайшоў праз Растоўскую вобласць, праз Беларусь, - працягвае прабабуля. – Тут і сустрэлі Перамогу. Многіх баявых сяброўак забрала ад мяне вайна. Ёсць іх магілкі і на беларускай зямлі. Беларуская зямля стала для мяне родным краем, тут я знайшла свой лёс. Тут выраслі мае дзеці, унукі, падрастаюць праўнукі.

Мне дзесяць гадоў. Я нарадзілася на мірнай зямлі і ніколі не чула выбухаў снарадаў. Я бачу, як будуюцца новыя дамы, ведаю, якое шчасце жыць, марыць. Але я ведаю, што чалавечае жыццё можа імгненна абарвацца. За тое, што на світанні я чую песні жаўрукоў, а не выбухі бомбаў, што радуюся цудоўным краявідам прыроды, што мае вочы свецяцца шчасцем, вялікі дзякуй і нізкі паклон вам, салдаты Вялікай Айчынай вайны, вялікі дзякуй і нізкі паклон табе, мая любімая прабабулечка Ганна Львоўна.

Дадатак
Лазаровіч Ганна Львоўна







За нашу Советскую Родину

СССР

УДОСТОВЕРЕНИЕ

За участие в героической обороне

СТАЛИНГРАДА

Указом ПРЕЗИДИУМА ВЕРХОВНОГО СОВЕТА СССР от 22 декабря 1942 г. награждён медалью

«ЗА ОБОРОНУ СТАЛИНГРАДА»

От имени ПРЕЗИДИУМА ВЕРХОВНОГО СОВЕТА СССР медаль «За оборону Сталинграда» вручена ________ 194_ г.

Д № 40378






Встреча Ветеранов.





 

Альшэўская Вікторыя